УДК 82

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ ІСЦІНЫ Ў ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА І РЫГОРА БАРАДУЛІНА

**Бараўцова Святлана Анатольеўна,**
ДУА “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” (г. Магілёў, Беларусь)

*Мы жывём сёння ў грамадстве, якое хварэе “дэфіцытам духу”. Гэта значыць, што злосць, прагнасць, карысць, абыякавасць пагражаюць “разбэсціць” нашы душы, душы нашых дзяцей. Усе падзеі сучаснага жыцця ўплываюць на дзіцячыя душы, прыгатаваныя для дабра. У чалавеку, які расце, усё павінна фарміравацца своечасова. Своечасова трэба закласці дабро, ідэалы, маральнае здароўе, каб гэтыя каштоўнасці засталіся на ўсё жыццё ў душах дзяцей. Духоўнасць надае сэнс жыцця чалавеку, у ёй чалавек шукае і знаходзіць адказы на пытанні: навошта ён жыве, якое яго прызначэнне ў жыцці, што ёсць дабро і зло, ісціна і зман, прыгожае і пачварнае.*

Зварот да хрысціянскіх ісцін у літаратуры — гэта невялікі крок да высвятлення бездухоўнасці, якая паразіла грамадства, адраджэнне нашых каранёў. У літаратуры прадметам вывучэння з’яўляецца мастацкі тэкст, які з’яўляецца ў той жа час і крыніцай маральнага выхавання дзяцей.

Разглядаючы сучасную літаратуру канца ХХ і пачатку XXI стагоддзяў, заўважаеш зварот многіх беларускіх пісьменнікаў да біблейскіх сюжэтаў, матываў і вобразаў. Біблія – гэта крыніца сапраўднай чалавечай мудрасці, у якой чалавек заўсёды знойдзе адказы на свае пытанні, апору і веру, яна дапаможа сфарміраваць у падлетка высокія маральныя якасці.

У. Караткевіч, пераасэнсоўваючы вобразы і біблейскія сюжэты, шукаў адказы на вострыя маральна-этычныя пытанні сучаснага быцця. Пісьменнік гаварыў пра тое, як проста людзі адракаюцца ад святынь, якія ўзбагачаюць чалавечыя душы (“Скарына пакідае Радзіму”):

Выгнанне. Выгнанне. Выгнанне.
Па волі зямных багоў
Спалілі браты-хрысціяне
Кнігі пра Бога свайго. [4, с.163]

Духоўнае самасцвярджэнне, па словах паэта, немагчыма без далучэння да агульначалавечых каштоўнасцей. Ён лічыў, што вечнае на Зямлі – “твой Люд і Край”, з імі звязваў “шчасце пасмяротнае і рай”:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу.
Але йдзі і не губляй спакой.
Ёсць замест прыватнай неўміручасці —
Бессмяротнасць нацыі тваёй.
Ты памрэш. Але ў бязмежным свеце
Будуць працвітаць твой Люд і Край...
Вер, што ў гэтым, вер, што толькі ў гэтым
Шчасце пасмяротнае і рай. [4, с. 394]

Лірычны герой У. Караткевіча – мужны духоўны заступнік Бацькаўшчыны. Той, хто свядома распяў сябе, як Ісус Хрыстос, на крыжы ў імя людзей:

Быў. Ёсць. Буду.
Таму, што заўжды, як пракляты,
Жыву бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх. [4, с. 239]

Верш "На Беларусі Бог жыве" – выдатны ўзор патрыятычнай лірыкі, у якім гучыць матыў богаабранасці роднай зямлі:

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
«На Беларусі Бог жыве», —
І няхай да веку жыве. [4, с. 241]

Таксама трэба спыніцца і на рамане "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" ("Евангелле ад Іуды"), у якім вандроўныя акцёры выступаюць ў ролі святых апосталаў і Хрыста і становяцца сімвалам веры ў дабро і справядлівасць. Аўтар сцвярджае, што без веры людзі – нішто. Галоўнае – паверыць у праўду і змагацца за яе, бо асноўная мэта таго ж Братчыка Хрыста: "Адпусціць замучаных на свабоду, рабоў – з ланцугоў, бедных – з халуп, мудрых – з турмаў, гордых – з ярма" [5].

Яшчэ адным паэтам ад Бога быў Рыгор Барадулін. Яго пяру належаць адны з лепшых твораў рэлігійна-хрысціянскага зместу:

Пусці ў душу Хрыста
Як госця-нехаджанца,
Каб свята села на куце…
Субожыўшыся ў мілаце,
Свае далічыш дні,
Як пацеркі ружанца… [3, с. 268]

Тэма Бога і веры – галоўная ў кнізе "Евангелле ад Мамы". Паэт нагадвае пра тое, што кожны з нас павінен несці ў душы святло, быць сапраўдным хрысціянінам, быць глыбока маральным у сваіх думках і паводзінах:

Як у сцюдзёную раку,
Памалу ў Біблію заходжу,
Бо веру, што душу злагоджу,
І думаю, бяду ўраку. [1, с. 5]

Выказваючы любоў і павагу да сваёй маці, паэт напаўняе матчыну тэму біблейскімі матывамі пакаяння ў вершы "Я царкву сваю ў душы нашу…":

Прычашчаюся з Яе рукі,
Спавядаюся прачыстай Маме. [1, с. 289]



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рыгор Барадулін стварыў цудоўныя лірычныя малітвы і псалмы, у якіх прапаведуе хрысціянскі гуманізм:

Божа, пашлі Беларусі
Ласку з Тваімі вачамі,
Сэрцы суцеш у скрусе,
Злітуйся над крывічамі. [2, с.18]

Ён, як біблейскі прарок, не стамляецца напамінаць людзям тыя хрысціянскія ісціны, на якіх адвеку трымаецца свет у кнізе “Псалмы Давідавы”:

Пілнавацiся кожны мусіць
Роднага Бога,
Пілнавацiся кожны мусіць
Роднай зямлі.
Не цяплее душа
Ля цяпельца чужога,
Каласіцца туга
На чужой араллі. [3, с. 307]

Паэт скіроўвае нас да Бога, каб мы змаглі адшукаць суцяшэнне, паратунак і веру ў лепшае.

Як бачым, свет радкоў У. Караткевіча і Р. Барадуліна па-біблейску мудры. У іх яны выступаюць як хрысціянскія філосафы, прапаведнікі агульначалавечай маралі, якія могуць дапамагчы падлетку стварыць той маральны ідэал, да якога трэба імкнуцца.

Безумоўна, літаратура ніколі не заменіць святыя біблейскія тэксты, але яна можа паказаць правільны кірунак, сфарміраваць каштоўнасці (самымі значнымі сярод якіх будуць духоўныя), матываваць маладое пакаленне да дабрадзейнага жыцця.

## Літаратура


1. Барадулін, Р. Евангелле ад Мамы: Кніга паэзіі / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. Літ., 1995. – 462 с.
2. Барадулін, Р. Міласэрнасць плахі: Кніга паэзіі / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. Літ., 1992. – 302 с.
3. Барадулін, Р. Збор твораў у 5 тамах. Том 3. Паэмы, вершы / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. Літ., 1999. – 444 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў у 8 тамах. Том 1. Вершы, паэмы / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. Літ., 1987. – 442с.
5. Караткевіч, У. Збор твораў у 8 тамах. Том 6. Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Раман / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. Літ., 1990. – 506с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова